# РЭФЕРАТ

Справаздача 41 с., 32 крын.

АЛЕСЬ АДАМОВІЧ, НАЦЫЯНАЛЬНАЕ БЫЦЦЁ, КАНЦЭПТАСФЕРА, АЎТАРСКАЯ ПАЗІЦЫЯ, АКСІЯЛОГІЯ, ГЕРМЕНЕЎТЫКА, ФІЛАСАФІЗМ, ПАЭТЫКА, ПСІХАЛАГІЗМ, ПЛЫНЯ СВЯДОМАСЦІ, АРХЕТЫП, ВОБРАЗ-КАНЦЭПТ.

Аб’ектам даследавання з’яўляюцца спецыфіка рэпрэзентацыі і аўтарскай інтэрпрэтацыі маральна-філасофскіх дамінант нацыянальнага быцця беларусаў у творах А. Адамовіча названага часу (аповесці “Карнікі”, “Апошняя пастараль”, “Нямко”, “Венера, або Як я быў прыгоннікам”, публіцыстычныя артыкулы і эсэ) ў еўрапейскім кантэксце.

Мэта работы – устанаўленне маральна-філасофскіх дамінант нацыянальнага быцця беларускага народа, актуалізаваных у творах А. Адамовіча 80-90-х гг. ХХ стагоддзя, правядзенне супастаўляльнай інтэрпрэтацыі канцэптасферы творчасці беларускага пісьменніка-мысляра і літаратараў-філосафаў, прадстаўнікоў еўрапейскай мастацкай традыцыі (А. Салжаніцын, Г. Бёль, Г. Грас, Ч.Мілаш і інш.).

У працэсе работы праводзіўся герменеўтыка-аксіялагічны аналіз вобразаў-канцэптаў, архетыпаў, сэнсавых дамінант творчасці А. Адамовіча 80–90-х гадоў ХХ ст. у параўнанні з творамі знакамітых еўрапейскіх пісьменнікаў-філосафаў.

У выніку даследавання ўпершыню ў беларускім літаратуразнаўстве створана мадэль актуалізацыі нацыянальных ідэйна-філасофскіх дамінант у канцэптасферы твораў А. Адамовіча 80–90-х гадоў ХХ стагоддзя, вызначаны семантыка і рэцэпцыя іх сістэмы ў еўрапейскай культурнай традыцыі; раскрыты ўплыў творчай эстэтыкі А. Адамовіча на паглыбленне маральна-эстэтычных ідэй і жанрава-стылёвых адкрыццяў беларускай літаратуры другой паловы ХХ стагоддзя, творчасць беларускага пісьменніка актуалізавана ў кантэксце еўрапейскай літаратурнай традыцыі.

Ступень укаранення – атрыманыя вынікі выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе БрДУ імя А.С. Пушкіна пры вывучэнні дысцыплін “Гісторыя беларускай літаратуры ХХ–ХХІ стст.”, “Метадалогія літаратуразнаўства”, “Методыка выкладання беларускай літаратуры”.

Навуковая і сацыяльна-эканамічная значнасць вынікаў даследавання заключаецца ў магчымасці выкарыстання распрацаваных матэрыялаў у адукацыйным працэсе вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь для засваення творчасці і ідэйна-філасофскіх поглядаў беларускага пісьменніка-мысляра А. Адамовіча пры напісанні курсавых, дыпломных работ, магістарскіх і кандыдацкіх дысертацый.